# Матар'ялы па абсьледваньні тэхнікі сялянскай гаспадаркі на Беларусі.

Пад рэд. С-Скандракова. Менск 1925. Інст. Бел-культуры.
Ба 25808

## Прадмова.

Друкаваныя ніжэй працы агрономаў М. Лайкова і М. Ганчарыка, як і працы С. Тупяневіча і А. Дзямідовіча, якія зьявяцца ў другім выпуску прац І. Б. К., напісаны ў 1923 г., калі аўтары гэтых прац, будучы яшчэ студэнтамі, працавалі ў якасьці навуковых супрацоўнікаў Беларускай Агрономічнай станцыі ў Банцараўшчыне.

Матар'ялы, якія выкарыстаны ў вышэйпамянутых працах, былі сабраны, галоўным чынам, у 1922 годзе, першым годзе існаваньня „Банцараўскай" дасьледчай станцыі, якая, па нашай агульнай думцы, павінна была быць „беларускай" ня толькі па назьве, але і па самай сутнасьці сваёй організацыі і працы, па ўсяму свайму жыцьцю і мэтодах працы.

Гэта беларуская станцыя павінна была ня толькі вывучаць сялянскую гаспадарку, зразумець мясцовыя ўмовы гаспадараваньня і працаваць на карысьць сялянства Беларусі, але і зрабіць яго чынным удзельнікам сваіх агрономічных думак, шуканьняў, усёй сваёй навукова-культурнай працы.

Зараз, дзякуючы таму, што агрономічная сэкцыя ІБК, якая працуе ў сталым контакце з НКЗ, з першых-жа крокаў сваёй дзейнасьці моцна ўзяла ў свае рукі сьцяг беларускай агрономічнай думкі; гэтыя „рэкогносцыйныя" працы па вывучэньні тэхнікі сялянскай гаспадаркі ня толькі ўбачаць сьвет, але маюць быць, дзякуючы падтрыманьню Саўнаркому і Дзяржаўнай Пляновай Комісіі, пашыраны і паглыблены.

Беларуская вёска і беларускае працоўнае сялянства існуюць і будуць існаваць і працаваць у шчыльнай сувязі з працоўнымі гарадоў і мястэчак Беларусі.

Колектыўная агрономічная творчасьць беларускага сялянства, якая ў значным стопні зьяўляецца вынікам шуканьняў яго найбольш выдатных прадстаўнікоў, сялянскага агрономічнага актыву, будзе расьці і мацнець, будзе ўсё больш прасякацца навукай, бо зараз, калі горад *стаў тварам* да вёскі, так і веска стала да яго тварам, з яе вопытам і шуканьнямі.

І сярод вытворчых сіл, якія павінны быць як мага хутчэй выяўлены і мобілізаваны, „мужыцкая" сельска-гаспадарчая думка і праца павінны прыцягнуць найбольшую ўвагу. Чалавек, яго думкі, сілы і праца патрабуюць увагі і аховы яшчэ больш, ніж іншыя багацьці прыроды.

Член-супрац. І. Б. К. Агроном *С. В. Скандракоў.*



## I. Агульныя ўмовы гаспадараваньня.

Агроном *М. Ганчарык.*

Высьледваньне тэхнікі сялянскай гаспадаркі Беларусі зроблена на падставе анкетнага матар'ялу, сабранага, галоўным чынам, у раёне Беларускай Агрономічнай станцыі (Банцараўшчына) і некаторых іншых раёнах былой непашыранай БССР. Матар'ялы сабралі супрацоўнікі станцыі, вучастковыя агрономы.

Апрацоўцы падлягала 20 больш характэрных анкет, якія дзеля непашыранае Беларусі павінны былі выявіць асноўныя рыскі тэхнічных прыёмаў гаспадараваньня беларуса-селяніна з тых месц, якія па сваіх прыродна-гістарычных і экономічна-гаспадарчых умовах зьяўляюцца характэрнымі дзеля ўсёй тэрыторыі.

Найбольш уважліва быў высьледаваны раён Бел. Агроном. Станцыі, які па сваіх прыродна-гістарычных умовах характэрны для большасьці тэрыторыі БССР і высьледваньне якога зьяўлялася патрэбным у першую чаргу для разгортваньня шырэй і глыбей агрономічна-дасьледчай працы самой станцыі.

Тэрыторыяльна анкетны матар'ял, які падлягаў апрацоўцы, разьмяркоўваецца так (згодна старому адміністрацыйнаму падзелу):

Менскі павет —13 (з іх 8 з раёну Банцараўшчыны)
Слуцкі „ — 3
Чэрвенскі „ — 3
Бабруйскі „ — 1

Абсьледваньню падлягалі гэткія вёскі:

| ВЁСКА. | ВОЛАСЬЦЬ. | ПАВЕТ. | Адлегласьць ад Менску. | Адлегласьць ад павету. | ГРУНТ. |
|---|---|---|---|---|---|
| Баравая | Сёмк.-Гарадз. | Менскі | 7 | 7 | Пяскі. |
| Масюкоўшчына. | „ | „ | 7 | 7 | ½ пяскі, ½ суп. і сугл. |
| Патрэба | „ | „ | 8 | 8 | Песк. глеб. (ёсьць жарства) |
| Х. Банцараўшчына | „ | „ | 10 | 10 | Пяскі (жоўтыя) |
| Зарэчча I | „ | „ | 13 | 13 | Пяскі (прыбл. да жарствы) |
| Зарэчча II | „ | „ | 12 | 12 | Пяскі |
| Качына | Старасельск. | „ | 13 | 13 | Пяскі і супяскі |
| Лапарэвічы | Заслаўскай | „ | 18 | 18 | Суглінкі і пяскі |
| Зас. Падсасоньне | Станькаўск. | „ | 20 | 20 | Суглінак |
| Кацягі | Самахвал. | „ | 15 | 15 | Супяскі |
| Алекшыцы | Беларуцкай | „ | 23 | 23 | Суглінак |
| Раўкуцэвічы | Радашковіцк. | „ | 29 | 29 | Суглінак і супяскі |
| Дашкі 1-ая | Хатэніцкай | „ | 36 | 36 | Пясок, рэдка сугл. (многа каменю) |
| | Вызьнянскай | Слуцк. | 130 | 45 | Супяскі, ёсьць суглінкі |
| Ісэрна | Пагосткай | „ | 120 | 30 | Супяскі і суглінкі лёгкія |
| Ніскавічы. | Пацэйкаўск. | „ | 100 | 15 | Супяскі і суглінкі |
| Нов. Рэчкі | Якшыцкай | Чэрвен. | 90 | 50 | Супяскі, рэдка пяскі |
| Кляньнік | Верхменск. | „ | 54 | 27 | Суглінкі ападзоленыя |
| Варонічы | Цытвянскай | „ | 45 | 27 | Суглінкі, мясцамі пяскі |
| Пекалічы | Сьценскай | Бабруйск. | — | — | 80% пяскоў, 10% сугл. і 10% торфу |